прыёмны пункт, аддз. сувязі і ААТ «ААБ Беларусбанк», гандлёвы комплекс, кафэ, аўтаматычная тэлефонная станцыя. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну. На паўн.-зах. ускраіне вёскі гарадзішча ранняга жалезнага веку.

**МАСЛАКОЎСКІ НАРОДНЫ АНСАМБЛЬ НАРОДНАЙ ПЕСНІ «ВЕСЯЛОСЦЬ».** Створаны ў 1988 у в. Маслакі Горацкага р-на пры сельскім Доме культуры, з 2011 дзейнічае пры цэнтралізаванай клубнай сістэме раёна. У 1991 прысвоена званне «народны аматарскі калектыў». Заснавальнік і кіраўнік А.У.Клешчанка. У складзе ансамбля 10 чал. ва ўзросце ад 35 да 60 гадоў. Асн. мэта дзейнасці — развіццё і прапаганда песеннай творчасці. У рэпертуары бел. нар. песні «Лявоніха», «Ты ж мяне падманула», «Ой, бяда мне, мужыкі», «А ў гародзе чорна рэдзька», «Ой, пад мостам», «Звончыкі», «Ой, каліна, ой, маліна», «Жыта жала», «У зялёную дуброву», «Ой, дзе ж ты была?», «Ночка цёмная», «Пра цешчу», «Забава», «Гармонік грае, грае», «Як у лесе грыбы не радзілі», «Ой, там каля рэчкі», «Не пытайся, маці», «Ехалі казачэнькі», «Ой, хадзема, жонка», «Ой, кудзеля, кудзеля мая», «Вёсачка мая», «Спявайце, госцейкі», творы бел. і рас. кампазітараў «Хлеб ды соль» Л.Захлеўнага, «Над акенцам маладзік» Я.Папова і інш. Калектыў — удзельнік міжнар. выстаўкі «Белагра» (Мінск, 2010), рэсп. свята фальклору і нар. майстроў «Александрыя збірае сяброў» (в. Александрыя Шклоўскага р-на, 2010, 2013) і інш.

*А.У.Клешчанка.*



*Маслакоўскі народны ансамбль народнай песні «Весялосць».*

**МАСЛАН** Ісаак Яфімавіч (14.6.1921, Мінск — 21.8.1996), беларускі мастак. Засл. дзеяч культуры Беларусі (1981). Скончыў Віцебскае маст. вучылішча (1941). Працаваў у галіне афармленчага мастацтва, плаката і прам. графікі. Выканаў эскізы афармлення Мінска да юбілейных дат (пачынаючы з 1946), Усебел. фестывалю моладзі ў Мінску (1957), Алімпійскіх гульняў 1980, шэрагу інш. спарт.-масавых мерапрыемстваў. Афарміў экспазіцыі ВДНГ БССР (1968, 1970), павільёна Беларусі на ВДНГ СССР (1949, 1954, 1969, 1982), экспазіцыі бел. раздзелаў на нац. выстаўках СССР у ГДР, Балгарыі, Польшчы, Венгрыі, Югаславіі, ФРГ, Іраку, Індыі, Фінляндыі, Францыі (1964—84). Выканаў эскізы шэрагу юбілейных медалёў.

*Г.А.Фатыхава.*

**МАСЛАЎ** Аляксандр Лявонавіч (11.9.1876, с. Благавешчанскае Арлоўскай вобл., Расія — 25.10.1914), расійскі збіральнік і даследчык нар. музыкі, педагог. Вучыўся ў Муз.-драм. вучылішчы пры Маскоўскім філарманічным т-ве (1895—1902). Член Муз.-этнаграф. камісіі (з 1901). У 1908—12 выдавец і рэд. час. «Музыка и жизнь». З 1907 выкладаў у Нар. кансерваторыі ў Маскве. Запісваў бел. песні ў Магілёўскай і Смаленскай губ., апрацоўваў іх і паказваў у этнаграф. канцэртах, апублікаваў бел. быліну «Тры асілкі». Складальнік «Ілюстраванага апісання музычных інструментаў, што захоўваюцца ў Дашкаўскім этнаграфічным музеі ў Маскве» (1909), у якім змясціў выявы некаторых бел. нар. інструментаў, іх замеры і гукарады. Адзначаў стылявыя адрозненні бел. нар. песеннасці ад роднасных усх.-слав. муз. культур.

*Тв.:* Былины, их происхождение, ритмический и мелодический склад. М., 1910.

**МАСЛАЎ** Мікалай Фёдаравіч (12.12.1912, с. Малая Ваўчанка Алтайскага краю, Расія — 5.2.1992), беларускі харавы дырыжор, педагог. Засл. дзеяч мастацтваў Беларусі (1955). Скончыў Маскоўскую кансерваторыю (1939). У 1940—41 працаваў з хорам Бел. радыёкамітэта, з 1944 у Дзярж. т-ры оперы і балета Беларусі, у 1947—67 кіраваў дзіцячым хорам сярэдняй спец. муз. школы пры Бел. кансерваторыі. Адначасова ў 1940—76 выкладаў у Бел. кансерваторыі, у 1945—49 — у Мінскім муз. вучылішчы, у 1977—87 у Мінскім ін-це культуры.

**МАСЛЕНІКАЎ** Павел Васілевіч (14.2.1914, в. Нізкая Вуліца Магілёўскага р-на — 6.9.1995), беларускі мастак тэатра, жывапісец, мастацтвазнавец, педагог. Засл. дзеяч мастацтваў Беларусі (1954). Нар. мастак Беларусі (1994). Канд. мастацтвазнаўства (1960). Скончыў Ін-т жывапісу, скульптуры і архітэктуры імя І.Рэпіна ў Ленінградзе (1953). З 1938 мастак Дзярж. тэатра оперы і балета Беларусі (з 1946 мастак-пастаноўшчык). З 1960 у Бел. тэатр.-маст. ін-це (да 1964 рэктар, у 1967—79 заг. кафедры). Тэ-

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

атр. творчасць М. засн. на звароце да жывапісна-аб'ёмнай дэкарацыі, ёй уласцівы рамантычнае, паэт. выказванне, выразнасць дэкарацый-пейзажаў у стварэнні нац. рэпертуару, арганічнасць гучання музыкі і дэкар. жывапісу, цэласнасць пастановачнай канцэпцыі драматургіі муз. спектакля і сцэнаграфіі. Аформіў балеты: «Бахчысарайскі фантан» Б.Асаф'ева (1949), «Чырвоны мак» Р.Гліэра (1950), «Шапеніяна» на музыку Ф.Шапэна (1952), «Маладая гвардыя» Ю.Мейтуса (1954), «Карсар» А.Адана, «Даліна шчасця» Ю.Бяльзацкага (абодва 1957), «Баядэрка» Л.Мінкуса, «Сцежкаю грому» К.Караева (абодва 1960), класічныя оперныя спектаклі «Тоска» Дж.Пучыні (1950), «Фра-Д'ябала» Д.Абера (1955), «Бальмаскарад» Дж.Вердзі (1961), «Джаконда» А.Панк'елі (1962) і інш. Выразнасцю каларыту, паэт. узнёсласцю і лірызмам адметныя пейзажы «Жнівень» (1953), «Золата бяроз» (1959), «На ўскраіне Мінска» (1963), «Над возерам» (1969), «Зямля беларуская» (1973). Шматгранна адлюстравана духоўнае жыццё чалавека ў тэматычных палотнах «Вярнуўся» (1979), «Вызваленне Магілёва» (1983), «Каля гары Машэкі» (1987) і інш. Аўтар манаграфіі «Беларускі савецкі тэматычны жывапіс» (1962), раздзела па мастацтве Беларусі для «Гісторыі мастацтва народаў СССР» (т. 8, 1977); адзін з аўтараў «Гісторыі беларускага мастацтва» (т. 4—6, 1990—94). Свае творы М. падараваў Магілёўскаму абл. маст. музею, якому прысвоена яго імя, перад будынкам музея — помнік М. (скульпт. В.Лятун, 1997).



*П.В.Масленікаў.*



*П.Масленікаў. Эскіз дэкарацыі да оперы «Фра-Д'ябала» Д.Абера. 1955.*

*Літ.:* Карнач П.А. П.В.Масленікаў. Мінск, 1973; Пракапцова В.П. Павел Масленников. Портрет художника в зеркале времени. Минск, 2012.

*В.П.Пракапцова.*

**МАСЛЕНІКАЎ** Уладзімір Паўлавіч (н. 12.1.1956, г. Мінск), беларускі жывапісец. Сын П.В.*Масленікава*. Скончыў Бел. тэатр.-маст. ін-т (1980). З 1992 выкладаў у Бел. ун-це культуры і мастацтваў. З 2011 заг. кафедры Бел. акадэміі мастацтваў. Працуе ў станковым жывапісе. Яго творы вылучаюцца глыбокай змястоўнасцю, лірычным настроем, стрыманай жывапіснай палітрай. Сярод работ: пейзажы «Захад» (1989), «Зямля дзядоў» (1993), «Ліпень», «Восень у Драздах» (абодва 1994), «Прыпяць» (1995), «Магілёў. Падніколле», «Дняпроўскія далячыні» (абодва 1997), «На радзіме бацькі» (1999), «На беразе возера» (2002), «Летні вечар» (2005), «Сакавік» (2006), «Мая Беларусь» (2008), «Набліжэнне халадоў» (2010), «Святая зямля» (абодва 2010), «Пачатак лета» (2011), «Лагойскія далі» (2012), «Востраў», «Над



*У.Масленікаў. Восеньскі настрой. 2013.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ